УДК 821.161.3 «1920/1930»

**І. У. Каляда**
Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт

# НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ ПРАЦЭСЫ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У ЛЁСЕ БЕЛАРУСКАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ (1920-Я – 1930-Я ГАДЫ)

У артыкуле разглядаюцца пытанні правядзення нацыянальнай палітыкі, вядомай як беларусізацыя, ролі нацыянальнай інтэлігенцыі, шляхоў і метадаў падпарадкавання яе партыйнаму кіраўніцтву. Вызначальную ролю ў лёсе беларускай інтэлігенцыі адыграла кампанія па барацьбе з «нацыянал-дэмакратызмам», якая стала лагічным вынікам фарміравання жорсткай, каманднa-бюракратычнай сістэмы наогул, заснаванай на рэжыме асабістай улады і ўсеагульнай падазронасці. Такі рэжым не мог цярпець самастойнасці ні ў эканоміцы, ні ў нацыянальнай палітыцы, не хацеў мірыцца з самастойнасцю мясцовых кадраў. Небяспеку для гэтага рэжыму прадстаўляла і нацыянальная інтэлігенцыя, па якой і прыйшоўся першы ўдар.

**Ключавыя словы:** нацыянальная культура, палітыка беларусізацыі, нацыянальная інтэлігенцыя, «нацыянал-дэмакратызм», настаўніцтва, рэпрэсіі, беларуская навука, мастацкая спадчына.

**I. U. Kolyada**
Belarusian State Technological University

# NATIONAL PROCESSES IN THE BELARUSIAN LANDS IN THE FATE OF THE BELARUSIAN INTELLIGENTSIA (1920–1930)

The article deals with issues of national policy known as belorussizatsiya, the role of national intelligence, ways and methods of its subordination to the party leadership. A decisive role in the fate of the Belarusian intelligentsia played a campaign against «national democracy», which is a logical result of the formation of a rigid, bureaucratic command system in general, based on the regime of personal power and general suspicion. Such a regime could not tolerate any independence in the economy, nor in national politics, would not accept the independence of local personnel. The danger to this regime and represented the national intelligentsia, of which the first blow fell.

**Key words:** national culture, Belarusization policy, national intelligentsia, «national democracy», mentoring, repressions, the Belarusian science, artistic heritage.

**Уводзіны.** У гісторыі Беларусі 1920-я гг. сталі часам правядзення палітыкі нацыянальна-культурнага будаўніцтва, вядомай як беларусізацыя. Гэта дзесяцігоддзе называюць «залатым», маючы на ўвазе ўзлёт інтэлектуальных сіл беларускага народа, які адбыўся ў гэтыя гады, уздым яго культуры, навукі, поспехі народнай адукацыі, што, несумненна, спрыяла росту нацыянальнай самасвядомасці.

З самага пачатку беларусізацыі і на працягу ўсяго ходу яе ажыццяўлення вельмі востра стаялі пытанні нацыянальнай палітыкі, ролі нацыянальнай інтэлігенцыі, шляхоў і метадаў падпарадкавання яе партыйнаму кіраўніцтву, развіцця нацыянальнай свядомасці. Па гэтых пытаннях сутыкаліся два погляды і два падыходы. Іх можна вызначыць як жорсткі, адміністрацыйна-сілавы і больш памяркоўны, прафілактычна-выхаваўчы. Па меры таго, як набірала моц палітыка ўсталявання аднапартыйнай сістэмы, першы падыход становіўся адзіна правільным.

**Асноўная частка.** Ужо ў канцы 1920-х гг. у рэспубліцы пачынае разгортвацца кампанія па разгрому так званага «нацыянал-дэмакратызму», якая вызначыла карэнны паварот у правядзенні беларусізацыі. І калі першапачаткова «нацыянал-дэмакратызм» вызначаўся як тэндэнцыя «ставіць нацыянальныя інтарэсы вышэй класавых», то пазней яго палітычныя ацэнкі сталі штучна завастрацца аж да правядзення аналогій з нацыянал-фашызмам [1, с. 43–44].

КП(б)Б прыкладвала вялікія намаганні для таго, каб адцясніць ад правядзення беларусізацыі нацыянальна свядомых прадстаўнікоў інтэлігенцыі, дабіцца манаполіі ў гэтай справе.

Усё часцей абвінавачванні ў падтрымцы ідэалогіі «нацыянал-дэмакратызму» сталі гучаць у адрас беларускай інтэлігенцыі. Упершыню аб гэтым было заяўлена ў верасні 1925 г. А. І. Крыніцкім, першым сакратаром ЦК КП(б)Б, на сходзе Мінскай гарадской партыйнай арганізацыі: «Отмечается неизбежное при росте хозяйства возрастание тяги некоторых элементов мелкобуржуазной интеллигенции к национально-демократической платформе, особенно под влиянием зажиточного крестьянства…» [2, с. 7–8].

А неўзабаве барацьба з інтэлігенцыяй, як лепшай, нацыянальна свядомай часткай, якая выступала супраць партыйнага дыктату,

становіцца афіцыйнай палітыкай. Сваю ролю ў гэтым адыграла камісія ЦКК КП(б) Украіны на чале з яе старшынёй У. П. Затонскім, якая вывучала практыку правядзення нацыянальнай палітыкі ў БССР. Высновы яе былі наступнымі: нацыянал-дэмакратызм у рэспубліцы перайшоў у адкрытае наступленне; падкрэслівалася непамерна вялікая роля інтэлігенцыі ў палітычным жыцці рэспублікі, з настроямі якой лічылася партыйнае кіраўніцтва; ставілася задача спыніць «занадта зацягнуўшуюся палітыку падладжвання пад вярхушку інтэлігенцыі», а таксама «прымірэнчыскія адносіны да розных ухілаў» [3].

Дзейнасць камісіі стала пачаткам нацыянальнай трагедыі. Палітычныя ацэнкі нацыянал-дэмакратызму сталі ненатуральна завастрацца аж да правядзення аналогіі з нацыянал-фашызмам. Пад ім сталі разумець варожую савецкаму ладу ідэалогію і практыку, контррэвалюцыйныя плыні, мэта якіх – рэстаўрацыя капіталізму ў БССР і арыентацыя на Захад [1, с. 3–4].

Калі спачатку нацыянал-дэмакратызм разглядаўся як нацыяналістычная плынь, якая можа ўзнікнуць на дробнабуржуазнай аснове ў любой нацыі, то пазней ён набыў ацэнку менавіта беларускага нацыяналізму. Больш таго, галоўнай небяспекай у ажыццяўленні нацыянальнай палітыкі на Беларусі сталі лічыць менавіта беларускі нацыянал-дэмакратызм [4, с. 164–165]. Пры гэтым палярна мяняліся ацэнкі мінулага. Ужо ўвесь нацыянальна-вызваленчы рух без якой-небудзь дыферэнцыяцыі, пачынаючы з Ф. Багушэвіча, стаў абвяшчацца рэакцыйным.

Такія вызначэнні патрабавалі выяўлення канкрэтных ворагаў, прычым аб'яднаных у буйныя антысавецкія арганізацыі. Абвінавачванні ў нацыянал-дэмакратызме ўсё часцей сталі гучаць у адрас такіх вядомых партыйных і дзяржаўных дзеячаў, як Д. Жылуновіч (старшыня Белдзяржвыдавецтва), У. Ігнатоўскі (прэзідэнт Акадэміі навук Беларусі), Д. Прышчэпаў (наркам земляробства), А. Баліцкі (наркам асветы) і інш., асабліва тых з іх, якія да ўваходжання ў склад КП(б)Б з'яўляліся членамі арганізацый рэвалюцыйна-дэмакратычнага кірунку. У ходзе кампаніі па выкрыцці «нацдэмаўшчыны» крытыка нярэдка накіроўвалася і супраць старшыні ЦВК БССР А. Чарвякова. На XVI з'ездзе КП(б)Б у 1937 г. ён падвергся яўна інспіраваным злосным нападкам з боку кіраўніцтва і дэлегатаў з'езда. Яму было прад'яўлена абвінавачванне ў тым, што ён з'яўляецца ідэйным натхняльнікам і кіраўніком нацыянал-апартуністычнага ўхілу у КП(б)Б і «нацдэмаўскага руху наогул».

Такім чынам, з умацаваннем адміністрацыйна-каманднай сістэмы палітычныя ацэнкі «нацыянал-дэмакратызму» становіліся ўсё больш вострымі, і неўзабаве справа дайшла да сур'ёзных абвінавачванняў вялікай групы беларускай інтэлігенцыі аж да абвяшчэння яе праціўнікамі савецкага ладу. Апагеем гэтай кампаніі стала сфабрыкаваная ад пачатку да канца справа, якая атрымала назву «Саюз вызвалення Беларусі». У канцы 1929 г. – пачатку 1930-х гг. быццам за прыналежнасць да гэтага Саюза было асуджана больш за 90 чалавек, галоўным чынам работнікі навукі, культуры, мастацтва і шэрагу наркаматаў рэспублікі. Сярод іх – наркам асветы А. Баліцкі, дырэктар выдавецтва «Беларусь» П. Ілючонак, наркам земляробства Д. Прышчэпаў. Кіраўніцтва гэтай арганізацыяй прыпісвалася І. Лёсіку, С. Некрашэвічу, В. Ластоўскаму – акадэмікам АН БССР. Усіх іх абвінавачвалі ў імкненні звергнуць савецкую ўладу і ўсталяваць беларускую буржуазную дзяржаўнасць. Як вынік – розныя тэрміны зняволення, высылкі, а ў 1937 г. амаль усе, хто праходзіў «па справе СВБ», былі асуджаны паўторна да вышэйшай меры.

Пад сцягам барацьбы з «нацдэмаўшчынай» моцны ўдар быў нанесены па розных групах творчай інтэлігенцыі. Па няпоўных даных, у 1930-я гг. было асуджана каля 90 членаў Саюза пісьменнікаў Беларусі, з якіх больш за 50 загінулі ў лагерах і турмах. Сярод іх такія выдатныя дзеячы культуры, заснавальнікі сучаснай беларускай літаратуры, як М. Гарэцкі, У. Галубок, М. Чарот, М. Зарэцкі і інш. Больш за 100 навукоўцаў страціла ў тыя гады АН БССР [5, с. 301]. Масавыя рэпрэсіі знішчылі значную частку работнікаў мастацтва, асветы.

З пункту гледжання тагачаснай афіцыйнай ідэалогіі небяспеку рэжыму прадстаўлялі школьныя настаўнікі, таму што менавіта на іх быццам бы абапіраліся ў сваёй контррэвалюцыйнай дзейнасці беларускія нацдэмы і сярод іх вербавалі сваіх прыхільнікаў. Таталітарызм праганяў са школы найбольш адукаваных, нацыянальна свядомых настаўнікаў. З пачатку 1930-х гг. рэпрэсіі сярод настаўнікаў пачалі насіць масавы характар, арыштоўвалі ўжо не па адным, а групамі. І што мог супрацьпаставіць гэтаму радавы настаўнік, хто мог яго абараніць, калі нават наркамы асветы не маглі абараніць сябе, сваё жыццё? Аднаго за другім па палітычных абвінавачваннях выключаюць з партыі, здымаюць з пасады, а потым арыштоўваюць і прыгаворваюць да вышэйшай меры пакарання наркамаў асветы А. А. Чарнушэвіча, А. І. Дзьякава, У. І. Півавара.

Многія настаўнікі былі арыштаваны без усялякіх падстаў. Іх месца займалі людзі мала падрыхтаваныя, без спецыяльнай адукацыі (асноўны склад настаўнікаў меў сярэднюю і

незакончаную сярэднюю адукацыю). Так, наркам асветы Е. Уралава, прызначаная на гэту пасаду ў ліпені 1938 г., мела пачатковую адукацыю. Зразумела, што ўсё гэта не магло не адбіцца на ўзроўні работы агульнаадукацыйнай школы.

У хуткім часе ўжо само навучанне на беларускай мове становіцца аргументам для абвінавачвання ў «нацыянал-дэмакратызме». Так здарылася з таленавітым вучоным, рэктарам БДУ У. Пічэтам, якога абвінавацілі яшчэ і ў празаходняй арыентацыі за тое, што ва ўніверсітэце вялося выкладанне на беларускай мове і чыталіся курсы лекцый па «Гісторыі славян» і «Гісторыі Польшчы». А менавіта гэты чалавек шмат зрабіў для паспяховага вырашэння задачы планамернага ўводу беларускай мовы ў розныя сферы грамадскага жыцця, і ў першую чаргу ў дзейнасць рэспубліканскага дзяржаўнага і партыйнага апарата. Бачачы, з якой цяжкасцю, а часам пры адкрытым ці завуаліраваным супраціўленні службовых асоб ідзе ўкараненне беларускай мовы ў справаводства дзяржаўных, партыйных, адміністрацыйна-гаспадарчых органаў, у сістэме народнай асветы, У. Пічэта выдае кнігу «Беларуская мова як фактар нацыянальна-культурны», якая дапамагла многім беларусам карэнным чынам змяніць сваё стаўленне да беларускай мовы. У сваёй рабоце вучоны пераканаўча даказаў, што ў беларусаў была і ёсць родная мова, адметная ад рускай, украінскай і польскай. Акрамя таго, ён беспамылкова вызначыў, што галоўнай апорай ў адраджэнні павінна стаць інтэлігенцыя як найбольш адукаваны і нацыянальнасвядомы пласт беларускага народа.

Пад выглядам барацьбы з нацыянал-дэмакратызмам з ВНУ былі выдаленыя вядомыя навукоўцы, прыхільнікі беларусізацыі, якія выдатна ведалі гісторыю, мову, культуру народа. Новых супрацоўнікаў вышэйшай школы, што прыйшлі на іх месца, мала хвалявалі нацыянальныя інтарэсы.

Спынілі сваё развіццё цэлыя напрамкі беларускай навукі. У 1938 г. былі закрыты інстытуты філасофіі і савецкага будаўніцтва і фізіка-тэхнічны з той прычыны, што ў іх практычна не засталося работнікаў. У распараджэнне Дзяржплана БССР перайшоў Інстытут эканомікі.

На доўгія гады былі падарваныя асновы для паспяховай падрыхтоўкі нацыянальных кадраў і развіцця навукі і культуры. Інтэлігенцыя ВНУ, падначаленая партыйным і класавым прынцыпам, вымушаная была прыстасоўвацца да таго курсу, які праводзіўся. Гэта зніжала творчы патэнцыял, дрэнна адлюстроўвалася на якасці работы выкладчыцкіх кадраў.

Пасля «справы СВБ» афіцыйная прапаганда звярнула свой позірк на літаратурны кірунак, дзе, нібыта, ізноў пачала актывізавацца нацдэмаўшчына. У хуткім часе былі арыштаваныя С. Грахоўскі, А. Звонак, С. Шушкевіч, У. Хадыка і інш.

Абстаноўка разгубленасці і хвалявання за заўтрашні дзень не садзейнічала стварэнню ўмоў для творчай працы пісьменнікаў і паэтаў, свабоднаму выяўленню поглядаў на рэчаіснасць. Людзі пачалі баяцца адзін аднаго, пазбягаць сустрэч і сяброў, усіх апанаваў страх. Масавыя арышты прывялі да таго, што ў 1938 г. літаратары знаходзіліся ў стане творчай дэпрэсіі, маральнай падаўленасці.

У 1930-я гг. перад літаратурай была пастаўленая задача служэння новаму лозунгу часу – «сацыялістычнаму будаўніцтву». Асноўным метадам літаратуры быў заяўлены метад сацыялістычнага рэалізму, галоўным прынцыпам якога аб'яўлялася «праўдзівае гісторыка-канкрэтнае адлюстраванне рэчаіснасці ў яе рэвалюцыйным развіцці».

У выніку ўсё гэта садзейнічала зніжэнню духоўнага і мастацкага ўзроўню літаратурных твораў. І таму заканамерна, што менавіта другая палова 1930-х гг. аказалася асабліва беднай у творчых адносінах.

Метад сацыялістычнага рэалізму, класавы падыход дамініравалі не толькі ў літаратуры, але і ў тэатральным і музычным мастацтве. Творчы працэс кантраляваўся цэнзурай, урадавымі і прафесійнымі арганізацыямі, якія настойвалі на тым, каб і ў тэатральных пастаноўках, і ў музычных творах адказваліся ад тэм гістарычнага мінулага, а шукалі актуальныя тэмы ў сучаснасці. У беларускім тэатры былі забаронены амаль усе лепшыя пастаноўкі 1920-х гг. Былі зняты з рэпертуару спектаклі па п'есах А. Міровіча «Кастусь Каліноўскі», «Машэка», М. Чарота «На Купалле», В. Шашалевіча «Апраметная», Я. Купалы «Тутэйшыя», п'есы Ф. Аляхновіча.

Пад шыльдаю змагання з нацыянал-дэмакратызмам на мастацкім фронце з ведама аддзела мастацтва Наркамасветы БССР пачынаецца чыстка мастацкай спадчыны. Шэраг мастакоў былі абвінавачаныя ў наследаванні буржуазнаму мастацтву. Так, у вобразах мастака М. Філіповіча (аўтар такіх палоцен, як «Ноч на Івана Купалу», «Бітва на Нямізе», «Паўстанне К. Каліноўскага») знайшлі ідэалізацыю мінулага, адлюстраванне народных забабонаў і кулацкіх настрояў. Яго ўдзел у экспедыцыях, як і сам факт паездак з мэтаю зарысовак старажытных цэркваў і царкоўнага абсталявання, быў расцэнены як варожая дзейнасць нацыянал-дэмакратаў. Ад мастакоў усё больш патрабавалі паказу жыцця з пафасам манументальнасці, праслаўлення вышэйшага кіраўніцтва. Тых, хто не згаджаўся з гэтым,

падвяргалі крытыцы як з боку партыйнага кіраўніцтва, так і з боку кіраўніцтва Саюза мастакоў. І ўжо нават самыя таленавітыя мастакі (каб апраўдаць гэтае званне і проста выжыць) вымушаны былі прыстасоўвацца, пісаць пра тое, аб чым гаварыла афіцыйная прапаганда.

Мастакі-графікі былі раскрытыкаваныя за імкненне адрадзіць традыцыі Скарынінскай бібліі, што расцэньвалася як праява нацдэмаўшчыны ў мастацтве. На заклік партыі «выкарчоўваць» ідэалізацыю мінулага Беларусі распачалася кампанія вынішчэння прац, якія можна было падагнаць пад гэту катэгорыю.

Пачынаецца рэгулярная чыстка бібліятэк ад нацдэмаўскай і іншай «варожай» літаратуры, што на справе прыводзіла да ачышчэння ад усяго нацыянальнага ў літаратуры і гісторыі. Былі забаронены падручнікі па гісторыі беларускай літаратуры М. Гарэцкага, мове – Я. Лёсіка, геаграфіі – А. Смоліча, гісторыі – У. Ігнатоўскага і інш. Знішчаліся творы У. Дубоўкі, Я. Пушчы, Ц. Гартнага, усіх тых таленавітых людзей, каго нападкаў лёс называцца нацдэмамі. Не дапускаліся да чытача часопісы «Узвышша», «Полымя», выданні Інстытута беларускай культуры па гуманітарных дысцыплінах. Органы Галоўліта вялі пастаянны кантроль за ходам знішчэння ў бібліятэках «класава варожай» літаратуры. А з прыняццем пастановы «Аб парадку захоўвання кніжных фондаў у масавых бібліятэках», (1933 г.) былі пакладзены асновы стварэння «спецыяльных» сховішчаў, у якія пападала забароненая літаратура. Фактычна, беларуская кніга стала ўяўляць сабой вялікую небяспеку.

У выніку гэтай кампаніі знішчаліся музейныя экспанаты, сабраныя навукоўцамі, багаты этнаграфічны і фальклорны матэрыял, старадрукаваныя кнігі і рукапісы. Спробы захаваць іх былі небяспечнымі. Ды ўжо і няма каму было практычна займацца захаваннем культурна-гістарычных помнікаў. Большая частка прадстаўнікоў інтэлігенцыі, тых, хто быў непасрэдна звязаны з адраджэннем культуры, мастацтва і навукі беларускага народа, была рэпрэсаваная.

За даволі кароткі тэрмін у якасці выканання сацыяльнага заказу дзяржавы і партыі з'яўляюцца цэлыя «навуковыя працы», якія тэарэтычна і гістарычна абгрунтоўвалі разгром нацыянал-дэмакратызму (С. Вальфсон «Идеология и методология нацдемократизма», А. Зюзькоў «Крывавы шлях беларускай нацдэмакратыі»). Многія важныя падзеі, што адбыліся падчас беларусізацыі, былі паказаны зусім у іншым свеце, як бы ў крывым люстэрку. Небяспечным лічылася нават імкненне творчай інтэлігенцыі сцвярджаць нацыянальны стыль у літаратуры, жывапісе, тэатральных пастаноўках і інш. Зразумела, што такія творы зрабілі адмоўны ўплыў на ўвесь ход беларусізацыі.

**Заключэнне.** Адзначым, што ўсе гэтыя працэсы былі цесна звязаныя са згортваннем НЭПа. Менавіта ў канцы 1920-х гг. стала згортвацца НЭПаўская мадэль развіцця сацыялізму, што не магло не адлюстравацца на ідэалагічнай дзейнасці партыі. Тэндэнцыя да спрашчэння, аднастайнасці, аднадумству паступова знішчыла ўсё, што не ўпісвалася ў сталінскую мадэль грамадскага ладу. Усё часцей нацыянальнае свядома сталі атаясамліваць з нацыяналістычным, з падазрэннем адносіцца да любых праяў нацыянальных пачуццяў і турбоце аб развіцці нацыянальнай культуры і мовы. Гэтая насцярожанасць даволі хутка стала выліваецца ў ваяўнічую нецярпімасць да любога іншадумства.

Трансфармацыя такога роду перш за ўсё адчулася ў сферы нацыянальна-дзяржаўнага, нацыянальна-культурнага будаўніцтва, дзе аб'ектыўна існавала глеба для неаднолькавых поглядаў на шматлікія пытанні практычнага ажыццяўлення нацыянальнай палітыкі.

Нельга сказаць, што разгром нацыянал-дэмакратызму быў спецыяльна задуманым ударам супраць нацыянальнай інтэлігенцыі. Ён быў лагічным вынікам фарміравання жорсткай, каманднa-бюракратычнай сістэмы наогул, заснаванай на рэжыме асабістай улады і ўсеагульнай падазронасці. Такі рэжым не мог цярпець самастойнасці ні ў эканоміцы, ні ў нацыянальнай палітыцы, не хацеў мірыцца з самастойнасцю мясцовых кадраў. Небяспеку для гэтага рэжыму прадстаўляла і нацыянальная інтэлігенцыя, як найбольш адукаваная частка грамадства, па якой і прыйшоўся першы ўдар.

**Літаратура**

1. Трэцяя сесія ЦВК БССР IX склікання. 10–16 снежня 1930 г. Стэнаграфічная справаздача. Мінск: Выд-ва ЦВК БССР, 1931. 452 с.

2. Криницкий А. И. Особенности внутрипартийного положения КП(б)Б. Доклад на собрании бюро ячейки Минской городской организации КП(б)Б 18 сентября 1925 г. Минск: Изд-во газеты «Звязда», 1925. 21 с.

3. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4. Воп. 21. Спр. 196. Арк. 108–109.

4. Сінякевіч А. За ленінскую лінію ў нацпалітыцы // Полымя. 1930. № 11–12.

5. Лыч Л., Навіцкі У. Гісторыя культуры Беларусі. Мінск: ВП «Экаперспектыва», 1997. 486 с.

## References

1. *Tretsyaya sesiya TsVK BSSR IX sklikannya. 10–16 snezhnya 1930 g. Stenagrafitchnaya spravazdatcha* [The third session of the CEC of the BSSR IX convocation. 10–16 December 1930. Verbatim Report]. Minsk, Vydavetstva TsVK BSSR Publ., 1931. 452 p.

2. Krinitskiy A. I. *Osobennosti vnutripartiynogo polozheniya KP(b)B. Doklad na sobranii byuro yacheyki Minskoy gorodskoy organizgatsii KP(b)B 18 sentyabrya 1925 g.* [Features inner-position of the CP(b)B. Report to the branch committee meeting of the Minsk city organization of the CP(b)B of September 18, 1925]. Minsk, Izdatel'stvo gazety "Zvyazda" Publ., 1925. 21 p.

3. National Archives of the Republic of Belarus (NARB). Fund. 4. I. 21. F. 196. L. 108–109.

4. Sinyakevich A. For the Leninist line in natspalitytsy. *Polymya* [Flame], 1930, no. 11–12 (In Belarusian).

5. Lych L., Novitsky U. *Gistoriya kul'tury Belarusi* [History of Belarusian Culture]. Minsk, VP "Ekaperspektyva" Publ., 1997. 486 p.

## Інфармацыя пра аўтара

**Каляда Іна Уладзіміраўна** – кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі. Беларускі дзяржаўныі тэхналагічны ўніверсітэт (220006, г. Мінск, вул. Свярдлова, 13а, Рэспубліка Беларусь).

## Information about the author

**Kolyada Ina Uladzimirauna** – PhD (History), Associate Professor, Assistant Professor, the Department of History of Belarus and Political Science. Belarusian State Technological University (13a, Sverdlova str., 220006, Minsk, Republic of Belarus).

*Паступіў 20.03.2018*